«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Удзельнікаў акцыі з запаленымі свечкамі штрафуюць

дапоўнена

16.11.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Акцыя 29 кастрычніка 2016 года ў Менску каля КДБ. Фота БелаПАН.

У судзе Маскоўскага раёна Мінска разглядаюцца адміністрацыйныя справы ўдзельнікаў акцыі памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій каля будынку КДБ у Мінску 29 кастрычніка.

Суддзя Наталля Вайцэховіч абвінаваціла **Марыну Адамовіч**, жонку былога палітвязня Міколы Статкевіча, ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве па ч.1 арт. 23.34 КаАП, з удакладненнем – у “дэманстрацыі запаленай свечкі”. У пратаколе правапарушэння, складзеным на Адамовіч, супрацоўнік міліцыі **Уладзімір Мацюшка** непасрэдна так і пазначыў:

“29 кастрычніка 2016 года Адамовіч М. каля будынку КДБ у Мінску прыняла ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве - пікетаванні, без дазволу Мінгарвыканкама, якое выразілася ў публічнай дэманстрацыі запаленай свечкі, чым парушыла парадак правядзення масавых мерапрыемстваў”.

Марына Адамовіч прыцягнутая судом да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры 5 базавых велічынь.

Наталля Вайцэховіч сёння таксама разглядае пратаколы правапарушэнняў, складзеныя на актывістаў **Леаніда Кулакова і Уладзіміра Яроменкі** за ўдзел у той жа самай акцыі 29 кастрычніка.

Леанід Кулакоў вельмі здзіўлены тым, што суд сёння разглядае ягоную адміністрайную справу.

> *"Кожны дзень гляджу паштовую скрыню, не было ні позвы, ні пратакола правапарушэння. Нават СМС-ку не даслалі... Дык адкуль я мог ведаць пра суд? І як у такой сітуацыі выглядае маё права на абарону?"*

Праваабаронцы паведамляюць, што пратакол разгледжаны без удзелу Леаніда КУлакова. Пастанова - штраф 50 базавых велічынь.

Дарэчы, 17 лістапада Кулакова чакае яшчэ адзін суд. На гэта раз за ўдзел у акцыю салідарнасці з Эдуардам Пальчысам каля будынку Мінскага гарадскога суда.

Уладзімір Яроменак таксама не прыйшоў на разгляд сваёй адміністрацыйнай справы. Яму прысудзілі штраф у памеры 50 базавых велічынь.

Нагадаем, увечары 29 кастрычніка ў Менску каля будынку КДБ на праспекце Незалежнасці адбылася акцыя памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій. Акцыю арганізавала грамадскае аб'яднанне «Малады фронт». Актывісты паставілі на прыступках ля галоўнага ўваходу ў будынак КДБ каля двух дзесяткаў лампад з запаленымі свечкамі і трымалі ў руках партрэты рэпрэсаваных. У акцыі ўдзельнічалі таксама Мікалай Статкевіч з жонкай Марынай Адамовіч. Супрацоўнікі міліцыі склалі на ўдзельнікаў жалобнай акцыі больш за дзесятак пратаколаў.

𝕏 Опубликовать



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца

інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі

"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года (дакумент)

Метамарфозы суда: дальнабойшчыка абвінавачвалі за падрыў петарды, але асудзілі за ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні

Мінімум 12 затрыманых: што вядома пра рэйд КДБ на адвакатаў

Заява аб прызнанні Васіля Палякова палітычным зняволеным

Заява аб прызнанні сямі чалавек палітычнымі зняволенымі

Бацьку траіх дзяцей асудзілі да года калоніі за каментары ў сацсетках

"Хто дапамагае з перадачамі?" Падрабязнасці масавага рэйду сілавікоў на сваякоў палітвязняў (дапоўнена)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Студзень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

Kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre
memorial

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde









E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

